Установа адукацыі

“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый

Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_______ Д.В.Герасімёнак
“___”__________2023 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
___________Ю.М.Галкоўская
“___” __________2023 г.

ВУЧЭБНА – МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСІ Ў ЗАМЕЖНЫХ МУЗЕЯХ

для спецыяльнасці 1-23 01 12 “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны” (па напрамках)

Складальнік: А.Я. Паўлава, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета факультэта інфармацына-дакументных камунікацый “11” красавіка 2023 г. пратакол №

Рэцэнзенты:

*Кафедра гісторыі і сацыяльных навук* установы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”

*Томашава І.Р.,* кафедры музеялогіі і этналогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння: кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны (пратакол ад 24 сакавіка 2023 г. № 9);

## ЗМЕСТ

1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4

2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 8

2.1 План-конспект лекцый 8

3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 26

3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў 26

3.2. Тэматыка рэфэратаў 36

4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 38

4.1 Заданні для самастойнай работы студэнтаў 38

4.2. Пытанні для самакантролю 40

4.2 Пытанні да заліку 43

5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 45

5.1 Тэматычны план (дзённае) 45

5.2 Асноўная літаратура 49

5.3 Дадатковая літаратура 49

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Культурная спадчына Беларусі ў замежных музеях” прадугледжана для студэнтаў I ступені вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках). Электронны вучэбна-метадычны комплекс распрацаваны ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці АСВА 1-23 01 12-2013; тыпавым вучэбным планам Е 23-1-014/пр-тып., зацверjданым 09.07.2021 і графікам адукацыйнага працэсу.

Вучэбна-метадычны комплекс адлюстроўвае змест дысцыпліны “Культурная спадчына Беларусі ў замежных музеях” і вызначае аб’ём ведаў, якія патрабуецца ад студэнтаў I ступені вышэйшай адукацыі. Пры распрацоўцы ВМК ўлічаны патрабаванні цыклу агульна-прафесійных і спецыяльных дысцыплін “Гісторыя Беларусі”, “Усеагульная гісторыя мастацтваў”, “Гісторыя і тэорыя музейнага дела”, “Ахова гісторыка-культурнай спадчыны”, “Музеі свету: музеі замежных краін”.

*Мэта* вывучэння дысцыпліны - сфарміраваць спецыяліста, які валодае неабходным аб’емам ведаў аб месцах знаходжання, магчымых спосабах увядзення ў навуковы і сацыякультурны зварот і формах спосабах рэстытуцыі беларускіх культурных каштоўнасцей, што апынуліся за межамі Рэспублікі Беларусь.

Змястоўная частка ЭВМК накіравана на вырашэнне наступных *задач* :

- дацць студэнтам сістэмныя веды аб асноўных падыходах да вызначэння паняццяў “культурная спадчына”, “гісторыка-культурная спадчына”, “гісторыка-культурныя каштоўнасці”;
- пазнаёміць студэнтаў з прычынамі,фактарамі, якія ўплывалі на працэс міграцыі культурных каштоўнасцей з беларускай тэрыторыі ў розныя гістарычныя перыяды ;

– даць уяўленне аб асноўных кірунках перамяшчэння і месцах сучаснага знаходжання аб’ектаў культурнай спадчыны Беларусі за межамі краіны;
– разгледзець прававыя асновы рэгулявання пытанняў рэстытуцыі ў міжнародных адносінах;
– вызначыць асноўныя праблемы вяртання культурных каштоўнасцей Беларусі, страчаныя на працягу гісторыі;
– разгледзець прынцыпы фарміравання заканадаўства ў галіне аховы культурных каштоўнасцей у Рэспубліцы Беларусь;
– азнаёміць студэнтаў з актуальнымі формамі ўвядзення ў навуковы і сацыякультурны зварот беларускіх культурных каштоўнасцей, што апыніліся за межамі Рэспублікі Беларусь.

Дысцыпліна “Культурная спадчына Беларусі ў замежных музеях” уваходзіць у модуль “Айчынныя і замежныя музеі” і адносіцца да кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі.

**Патрабаванні да кампетэнцый.**

Засваенне дысцыпліны “Культурная спадчына Беларусі ў замежных музеях” павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый:

СК-7. Аналізаваць сучасны стан музейных устаноў Беларусі і замежжа, ацэньваць перспектывы іх далейшага развіцця, у тым ліку з суб’ектамі турыстычнай дзейнасці.

СК-8. Выкарыстоўваць сучасныя веды аб культуры і тэндэнцыях яе развіцця ў музейнай, турыстычнай, мэнэджэрскай дзейнасці, ахове культурнай спадчыны, навыкі педагагічнага і аратарскага майстэрства ў яе інтэрпрэтацыі.

У адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта да кампетэнцый выпускніка па дысцыпліне “Культурная спадчына Беларусі ў замежных музеях” выпускнік павінен *ведаць:*

– асноўныя падыходы да вызначэння паняццяў “культурная спадчына”, “гісторыка-культурная спадчына”, “гісторыка-культурныя каштоўнасці”;

– ключавыя тэрміны ў галіне рэстытуцыі культурных каштоўнасцей;

– ролю і функцыі дзяржаўных органаў і грамадскіх аб’яднанняў, што займаюцца пытаннямі прававога рэгулявання рэстытуцыі культурных каштоўнасцей у Еўропе, краінах СНД, Рэспубліцы Беларусь;

– сучасныя методык правядзення пошуку, выяўлення, атрыбуцыі і вяртання культурных каштоўнасцей , страчаных у ходзе войн і рэвалюцый.

Студэнт павінен *умець:*

– аналізаваць крыніцы і літаратуры для пошуку беларускіх культурных каштоўнасцей, што апынуліся за межамі Рэспублікі Беларусь;

– выдзеляць этапы ў гісторыі перамяшчэня аб’ектаў культурнай спадчыны;

– выкарыстоўваць юрыдычныя дакументы для доказу права на культурную каштоўнасць;

– выкарыстоўваць актуальныя формы ўвядзення ў навуковы і сацыякультурны зварот беларускіх культурных каштоўнасцей, што апынуліся за межамі Рэспублікі Беларусь.

Для павышэння эфектыўнасці кіравання адукацыйным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, методыку актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Пры вывучэнні курса “Культурная спадчына Беларусі ў замежных музеях” выкарыстоўваюцца сучасныя метады навучання і камп’ютарныя тэхналогіі.

Да эфектыўных педагагічных тэхналогій і методык, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач адносяцца:

- гісторыка-тэматычны падыход;
- тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
- тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
- камунікатыўныя тэхналогіі.

Курс вывучаецца студэнтамі ў 6 семестры у форме лекцыйных, семінарскіх і практычных заняткаў. Для дзённай формы навучання вучэбным планам адведзена 36 аўдыторных гадзін: лекцыі – 22 гадзіны, семінарскія заняткі – 10 гадзін. Лекцыі раскрываюць асноўныя праблемы па кожнай тэме дысцыпліны “Культурная спадчына Беларусі ў замежных музеях”. Семінарскія заняткі праводзяцца па тэмах курсу, якія патрабуюць набыцця практычных навыкаў працы з дакументамі, замацавання тэарэтычных ведаў, атрыманых на лекцыях і ў выніку самастойнай працы над навучальным матэрыялам.

Працаёмкасць дысцыпліны складае 3 залiковых адзінкі. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў па выніках курса - залік.

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1. ПЛАН-КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ

***Уводзіны.***

Змест і мэты вучэбнай дысцыпліны “Гісторыка-культурная спадчына Беларусі ў замежных музеях”. Структура вучэбнай дысцыпліны. Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі гістарычнымі і музеязнаўчымі дысцыплінамі. Агляд даследаванняў і літаратуры па вучэбнай дысцыпліне. Формы навучання і кантролю.

### Раздзел I. Гісторыка – культурная спадчына Беларусі як частка сусветнай спадчыны

***Тэма* 1.1. *Культурная спадчына Беларусі***

Станаўленне тэрміна "спадчына" ў навуцы. Асноўныя падыходы да вызначэння паняццяў “культурная спадчына”, “гісторыка-культурная спадчына”, “гісторыка-культурныя каштоўнасці”, “нацыянальныя культурныя каштоўнасці” у беларускім і сусветным заканадаўстве. Для каго уяўляе каштоўнасць культурная спадчына: супольнасць, нацыя дзяржава, чалавецтва. Вызначэнне культурнай спадчыны ў міжнародных канвенцыях.

Каштоўнасці, уласцівыя культурнай спадчыне. Умовы фарміравання і захавання культурнай спадчыны Беларусі. Беларуская культура як частка сусветнай спадчыны. Музейны фонд як частка гісторыка-культурнай спадчыны. Бібліятэчны фонд  як частка гісторыка-культурнай спадчыны. НАФ як частка гісторыка-культурнай спадчыны.

Гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь і іх класіфікацыя. Матэрыяльныя і нематэрыяльныя гісторыка- культурныя каштоўнасці. Катэгорыі гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Рухомыя і нерухомыя матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Права і формы ўласнасці на гісторыка-

культурныя каштоўнасці. Сэнс аховы культурнай спадчыны. Турыстычны патэнцыял нацыянальнай культурнай спадчыны ва ўмовах культурнай глабалізацыі.

### *Тэма 1.2. Рухомыя каштоўнасці і метады іх абароны. Музеі і міжнародный абарот культурных каштоўнасцей*

Агульныя пытанні міжнароднай аховы культурнай спадчыны. Заканадаўчае рэгуляванне адносін уласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці. Вызначэнне культурных каштоўнасцей у міжнародным праве. Культурная спадчына к тавар. Попыт на культурную спадчыну. Попыт на культурную спадчыну з боку ЗША, Вялікабрытаніі, Швецыі, Японіі, Францыі і Швейцарыі. Асноўныя групы "спажыўцоў" культурнай спадчыны. "Чорны рынак" гістарычных і культурных каштоўнасцей. Незаконны гандль культурнай спадчынай і яго віды.

Агульнапрызнаныя прынцыпы і нормы міжнароднага права, рэгулюючыя абарот культурных каштоўнасцей і дзейнасць музеяў. Пытанне аб правах твораў мастацтва, якія ўступаюць у канфлікт з правам уласнасці на іх. Барацьба музеяў і законных уладальнікаў за творы мастацтва, канфіскаваныя, выкрадзеныя або страчаныя ў бурных перыпетыях XX стагоддзя. Праблема дакументальнага пацверджання прыналежнасці перамешчанга твора мастацтва да збору канкрэнага музея.

Рэкамендацыі ЮНЕСКА "Аб ахове рухомых культурных каштоўнасцей". Палажэнні ЮНЕСКА-УНІДРУА аб дзяржаўнай ўласнасці на не выяўленыя культурныя каштоўнасці. Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы аховы культурных каштоўнасцей. "Намюрская дэкларацыя" 2015 г. : Культурная спадчына ў XXI стагоддзі для лепшага сумеснага жыцця".Ахова культурных каштоўнасцей як адзін з накірункаў дзейнасці ІКОМ.

### *Тэма 1.3. Гістарычны аспект перамяшчэння культурнай спадчыны Беларусі*

Прычыны міграцыі гісторыка-культурнай спадчыны. Гісторыка-культурная і духоўная спадчына беларускага народа і праблема вываза культурных каштоўнасцей у ходзе ваенных канфліктаў эпохі Сярэднявечча і Новага часу.

Заняпад дзяржаўных утварэнняў, існуючых раней на тэрыторыі Беларусі. “Агульнасць гісторыі” і “агульная спадчына з суседзямі”. Сцягванне дакументальнай спадчыны ў архівасховішча г.Масквы і Пецярбурга пасля ўваходжання беларускіх тэрыторый у склад Расійскай імперыі. Канфіскацыя ў неблаганадзейных асоб і перавоз дакументальнай спадчыны і твораў мастацтва ў Расію пасля паўстанняў 1830-1831 і 1863-1864 гадоў. Дзейнасць расійскіх навуковых устаноў і экспедыцый па вывучэнню, збіранню гісторыка-культурнай спадчыны на тэрыторыі Беларусі. Вываз калекцый з тэрыторыі беларусі прыватнымі калекцыянерамі ў XIX ст. Перавоз калекцыі графа Румянцава з Гомеля ў Маскву. “Архіў заходнерускіх уніяцкіх мітрапалітаў” як аснова Румянцаўскага музея ў Маскве. Перавоз збора ваенна-гістарычнага профілю Івана Каладзеева ў Гістарычны музей ў Маскве. Лёс Літоўскай Метрыкі. Перамешчаныя беларускія кнігі і кніжныя калекцыі. Месцы знаходжання аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, перамешчанай у той перыяд. Зборы беларускай дакументальнай спадчыны ў прыватных калекцыях расійскіх гісторыкаў.

Эвакуацыя ў цэнтральныя раёны Расіі культурных каштоўнасцей з тэрыторыі беларускіх губерній падчас баявых дзеянняў Першай сусветнай вайны 1914 – 1918 гг. Лёс калекцый Гродзенскага статыстычнага камітэта (манеты Берштаўскага клада, прускія і польскія срэбраныя манеты). Вываз найбольш каштоўных дакументаў Віленскага архіва старажытных актаў у Яраславль і Віленскага музея старажытнасцяў у Маскву ў 1915 г. Лёс беларускіх музейных збораў у міжваенны перыяд XX ст. Эвакуацыя Мінскага царкоўна-археалагічнага музея ў Рязань. Рэшткі загінуўшага ў полымі ваенных і рэвалюцыйных падзей музейнага збора А.Ельскага ў

Літве, Польшчы і Украіне. Вываз музейных беларускіх каштоўнасцей ў Польшчу падчас польска-савецкай вайны 1919-1921 гг. Перамяшчэнне ў Польшчу экспанатаў, сабраных ў 1920 г. Мінскім таварыствам аховы помнікаў. Лёс бібліятэкі Храптовічаў. Дзейнасць народнага камісарыяты асветы і Цэнтральнага архіва Беларусі па вяртанню беларускай культурнай спадчыны, вывезенай ў гады Першай сусветнай вайны.

Абмеркаванне пытанняў рэстытуцыі на Першай Усебеларускай канферэнцыі архіўных супрацоўнікаў у 1924 г. і Першым з'ездзе даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі ў 1926 г. вывучэнне пытання вяртання Літоўскай метрыкі, бібліятэк Храптовічаў і Каладзеева. Стварэнне навуковай базы перамешчаных культурных каштоўнасцей беларусі ў гады беларусізацыі. Асноўныя праблемы вяртання культурнай спадчыны: нізкі ўзровень цікавасці да ўласна беларускіх культурных каштоўнасцей дарэвалюцыйнага перыяду (1917 г.), а менавіта прадметаў "магнацкага» і царкоўнага" паходжання; колькасны (а не якасны) падыход пры вяртанні і аднаўленні даваеннага (1913 г.) ўзроўню нацыянальнага багацця; акрамя таго, найбольш каштоўныя, рэдкія і старажытныя каштоўнасці часта накіроўваліся ў галоўныя цэнтры краіны-Маскву і Ленінград. Распродаж музейных каштоўнасцей Беларусі на замежных аўкцыёнах у 1920-я гады. Перамяшчэнне беларускіх архіваў у 1917 – 1941 г. Праблема рэстытуцыі культурных каштоўнасцей ва ўзаемаадносінах СССР і Польскай дзяржавы. Палітыка Польшчы па вывазу беларускіх культурных каштоўнасцей з тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. Стварэнне, дзейнасць і лёс калекцый беларускага музея імя І.Луцкевіча.

### *Тэма 1.4. Праблемы перамяшчэння культурных каштоўнасцей Беларусі ў перыяд Другой сусветнай вайны*

Нацысцкія структуры грабяжу музейных збораў. Вываз культурных каштоўнасцей нацыстамі з тэрыторыі еўрапескіх краін у гады Другой

сусветнай вайны. Пытанні згубленых і перамешчаных культурных каштоўнасцяў у савецкай музейнай справе 1940-1950-х гадоў. Дзейнасць НДІ краязнаўчай і музейнай работы, звязаная з ацэнкай музейных страт СССР падчас вайны. Праблемы вяртання страчаных культурных каштоўнасцяў, якія былі незаконна набыты нацыстамі ў перыяд Другой сусветнай вайны і прададзеныя ў музеі, а таксама прыватным калекцыянерам.

Эвакуацыя культурных каштоўнацей у савецкі тыл. Перамяшчэнне нацыстамі культурных каштоўнасцей з тэрыторыі БССР у Рыгу і Кёнігсберг у гады Другой сусветнай вайны. Страты музеяў БССР. Спіс Дзяржаўнай мастацкай галерэі.БССР. Дзейнасць А.В.Аладавай. Арганізацыя вяртання культурных каштоўнасцей пасля заканчэння вайны і яе вынікі. Архіўныя дакументы аб арганізацыі вяртання беларускіх каштоўнасцей.

***Тэма 1.5. Спадчына беларускіх магнацкіх родаў за межамі краіны***

Радавыя архівы буйных землеўладальнікаў дасавецкага перыяду і іх месца ў архіўнай спадчыне Беларусі. Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў у канцы XVIII - першай палове XX стст. Экспедыцыя Віленскай навучальнай акругі і Віленскай археаграфічнай камісіі ў Нясвіжскі архіў Радзівілаў у 1867 г. Лёс радзівілаўскай часткі архіва Вялікага Княства Літоўскага (1685–1946 гг.). Дакументальныя страты Нясвіжскага архіва Радзівілаў у другой палове XVIII – першай палове XX стагоддзяў. Гісторыя польскай і беларускай частак Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў падчас Другой сусветнай вайны. Геаграфія перамяшчэнняў і лёс дакументаў архіва Нясвіжскай ардынацыі кн. Радзівілаў у другой палове XVIII – першай палове XX стст. Праграма «Памяць свету”.

Спадчына Сапегаў у Польшчы, Расіі, Keніі. “Сапежанскі збор”. Спадчына Храптовічаў. Калекцыі Чартарыйскіх і іх лёс. Мастацкія калекцыі Чартарыйскіх у складзе Нацыянальнага мастацкага музея ў Варшаве. Калекцыі Эрых фон Гутэн Чапскага і іх перавоз у Кракаў. Нумізматычная

калекцыя Э. Гутэн-Чапскага ў м. Станькава Мінскай губерні як аснова сучаснага Музея Чапскіх у Кракаве. Збор Караля Чапскага і яго перамяшчэнне ў Маскву. Збор рода Цеханавецкіх.

***Тэма 1.6. Культурныя каштоўнасці Беларусі ў архівах, музеях і бібліятэках краін Еўропы і Амерыкі***

Лёс Крыжа Ефрасінні Полацкй. Прадметы са збора Мінскага гістарычнага музея ў Аўстрыі. Экспанаты з калекцыі Татура на Ўкраіне. Рукапісы В.Дуніна-Марцінкевча ў Бельгіі. Даспехі Радзівілаў у Вялікабрытаніі і ЗША. Гарматы Радзівілаў Германіі і Швецыі. Дадаткі да карты Т.Макоўскага ў Швецыі. Партрэты з мастацкай калекцыі Радзівілаў у Польшчы. Жывапіс, Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, мініяцюры са збору Радзівілаў у Нясвіжы ў складзе калекцый нацыянальных музеяў і каралеўскіх замкаў Варшавы і Кракава, Львоўскага гістарычнага музея, Літоўскага мастацкага музея ў Вільні. Лаўрышэўскае Евангелле, харугвы паўстванцаў 1863-1864 гг., фотаздымкі К.Каліноўскага ў Польшчы. Архіў БНР у Францыі.

Культурная спадчына Беларусі ў Эрмітажы, Расійскім этнаграфічным музеі і Расійскім гістарчным музеі. Беларускія дарэвалюцыйныя паштоўкі ў музеі архітэктуры імя Шчусева ў Маскве. Даваенныя беларускя кінафільмы ў сховішчы Дзяржфільмкінафонда. “Палесскі фотаархіў” Юзефа Абрэмбскага. Калекцыя Тышкевічаў у Літве. Слуцкія паясы ў у музейных зборах Польшчы (Варшава, Кракаў, Познань, Гданьск), Украіны (Кіеў, Львоў), Расіі (Масква, Санкт-Пецярбург), Літвы (Вільнюс, Каўнас), у прыватных калекцыях.

Мастацкія зборы Радзівілаў і Чартарыйскіх у Польшчы. Шэдэўры І.Хруцкага ў музеях Польшчы і Расіі. 8 партрэтаў і шабля-баторaўка з эвакуяванай у 1915 годзе калекцыі Урсын-Нямцэвічаў у Скоках у фондах Калужскага аб'яднанага музея-запаведніка. Работы С.Жукоўскага ў музеях Польшчы і Ўкраіны. Творы Напалеона Орды ў Нацыянальным музеі ў Кракаве. Творы Марка Шагала ў музеях Расіі, краін Еўропы і ЗША. Работы К.Малевіча ў музейных установах РФ. Падчына Ф.Рушчыца ў музеях і

прыватных калекцыях Літвы, Польшчы, Расіі і ЗША. Мастакі Парыжскай школы жывапісу – выхадцы з Беларусі. Палотны Х. Суціна ў найбуйнейшых музеях Францыі, ЗША, Ізраіля, Швейцарыі, таксама ў калекцыях музеяў Расіі (Эрмітаж), Аўстрыі, Даніі, Японіі, Вялікабрытаніі. Спадчына Льва Бакста. Спадчына Аляксандры Экстэр. Творы мастака Б.Заборава ў музеях еўрапейскіх краін.

***Тэма 1.6. Дакументальная спадчына і кніжныя помнікі Беларусі у архівах і бібліятэках замежных краін***

*Міграцы і месцы знаходжання.* Комплекс “Архіў Антоніо Тызенгаўза” у Польшчы. Архіў і бібліятэка Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў у Польшчы.

Перавоз Радзівілаўскай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбург і перадача яе ў веданне ў бібліятэкі Акадэміі навук (БАН) у жніўні 1772 г. па загаду Кацярыны II. Стварэнне на яе аснове на працягу XVIII ст. асобнай калекцыі. Страта часткі бібліятэкі на працягу знаходжання яе ў Расіі. Лёс часткі біблятэк, што засталася ў БАН.

Перадача дублетаў з Нясвіжскай бібліятэкі ў Маскоўскі універсітэт дзеля аднаўлення бібліятэкі, якая была знішчаная ў 1812 г. Перадача часткі кніг з бібліятэкі Радзівілаў у Гельсінгфорскі універсітэт (Фінляндыя). Сучасная праца Нацыянальнай бібліятэкі па бібліяграфічнай рэканструкцыі калекцыі (у камп'ютэрным рэжыме). Размяшчэнне часткі радзівілаўскіх кніг у складзе славянскага аддзялення БАН у 1882 г. Перадач ў 1920-я гады Нясвіжскай бібліятэкі ў асноўныя фонды бібліятэкі РАН у Петраградзе.

Бібліятэкі Сапегаў у Слоніме, Ружанах (Пружанскі раён), Дзярэчыне (Зэльвенскі раён) і польшчы – у Кодані. Перамяшчэнне часткі кніг у бібліятэку Віленскай езуіцкай акадэміі і ў дар Таварыству аматараў навук у Варшаве. Кніжныя зборы Сапегаў у бібліятэцы Варшаўскага ўніверсітэта. Перавоз вясковай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбург у 1834 г.

Інкунабулы з беларускімі правененцыямі ў сховішчах Расіі, Украіны, Эстоніі. Кнігі бібліятэкі Полацкай езуіцкай калегіі ў бібліятэцы Санкт-Пецярбургскага універсітэта. Інкунабулы і палеатыпы з бібліятэкі Храптовічаў у Шчорсах у складзе пазасталай частцы кнігазбору у бібліятэцы АН Украіны ў Кіеве. Страсбургскае выданне 1496 г. з экслібрысам Нясвіжскай бібліятэкі і пячаткай "Biblioth.Imper.Acad.Scien." у каталозе інкунабулаў універсітэцкай бібліятэкі ў Тарту.

Архіўная частка Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні ў сучасных сховішчах . Склад калекцыі архіўных матэрыялаў : архівы газет "Наша ніва", "Гоман", "Голас беларуса", часопісаў "Крывіч", "Маланка" і інш.; архівы беларускіх партый, камітэтаў, саюзаў, таварыстваў; шматлікія асабістыя архівы. Картатэчны вопіс рукапісаў і кніг Беларускага музея ў Вільні.

Рукапісны фонд № 21 на базе архіўных матэрыялаў былога Віленскага беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Акадэміі навук Літвы за перыяд ад XV ст. да 1943 г. Мастацкія тэксты і публіцыстыка заходнебеларускіх аўтараў у складзе фонда: літаратурная спадчына М.Танка, М.Машары, Н.Арсенневай, Х.Ільяшэвіча і менш вядомых літаратараў. Калекцыі фальклорных твораў, запісаных Я.Драздовічам, А.Салагубам, У.Паўлюкоўскім і іншымі збіральнікамі памятак традыцыйнай народнай культуры. Другі раздзел матэрыялаў ВБФ (№ 21) : дакументы аб дзейнасці грамадска-палітычных арганізацый і партый, а таксама культурна-грамадскіх і навуковых таварыстваў, якія існавалі ў 1917—1939 гг. Крыніцы перыяда сярэднявечча ў складзе ВБФ №21 .

Беларускія дакументы ў фондах літоўскага і беларускага кампазітара Канстанціна Галкоўскага і вядомага адваката і грамадскага дзеяча 1-й пал. XX ст. Тадэвуша Урублеўскага. Асабістыя фонды рэдактара часопіса "Kurjer Wilenski" Людвіка Абрамовіча і ідэолага "краёвасці" (культурна-грамадскага

і палітычнага сужыцця народаў былога Вялікага Княства Літоўскага), пісьменніка і этнографа, Часлава Янкоўскага, архівы літаратуразнаўца Люцыяна Узембла.

Матэрыялы пра стан хрысціянскіх канфесій у Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы ў Вільні .Дакументы па гісторыі беларускага друку пачатку хх ст. у фондах Літоўскага цэнтральнага дзяржаўнага архіва. Дакументы Беларускага выдавецкага таварыства ў Вільні.

Дакументальныя архіўныя матэрыялы фонду 582 у Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы ў Вільні як крыніца для вывучэння гісторыі БНР, грамадска-палітычных кантактаў беларусаў і літоўцаў у кан. 10-х — пач. 20-х гг. мінулага стагоддзя.

Дакументы Літоўскай Метрыкі, пергаментныя дакументы са збору Радзівілаў, дакументы сеймаў і сеймікаў, універсалы, выпісы актаў з гродзкіх і земскіх кніг у Галоўным архіве старадаўніх дакументаў (AGAD) у Варшаве. Гістарычныя дакументы XVIII—XIX стст., звязаныя з нацыянальна-вызваленчымі рухамі, матэрыялы, звязаныя з паўстаннем пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, з падзеямі паўстанняў 1830—1831 гг. і 1863—1864 гг. Крыніцы беларускага паходжання ў трэцім аддзеле AGAD "Акты сем'яў і прыватных асоб…" : фрагменты архіваў розных галін роду Радзівілаў ад яго пачынальнікаў з сярэдзіны XV ст. Зборы дакументаў з гісторыі Беларусі ў складзе прыватных архіваў, напрыклад, Браніцкіх, Патоцкіх, Прозараў і Ельскіх, Тызенгаўзаў і інш.

Архіўная беларусіка ў Варшаве ў аддзелах рукапісаў Нацыянальнай і універсітэцкай бібліятэк, у Вроцлаве — у аддзеле рукапісаў бібліятэкі імя Асалінькіх, у Кракаве — ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі Польскай Акадэміі навук, аддзеле рукапісаў бібліятэкі Ягелонскага універсітэта, у бібліятэцы Чартарыйскіх, у Познані ў бібліятэцы Рачыньскіх, у бібліятэцы ПАН у Курніку і г.д.

Беларуская дакументальная спадчына ў архівах, бібліятэках і музеях Расійскай Федэрацыі. Дзяржаўны гістарычны музей. Дакументы з гісторыі ВКЛ у Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве. Расійскі дзяржаўны архіў літаратуры і мастацтва : матэрыялы А.Александровіча, З.Жылуновіча (Ц.Гартнага), У.Дубоўкі, Я.Коласа і Я.Купалы і інш. Дакументы па гісторыі Беларусі ў Расійскім цэнтры захоўвання і вывучэння дакументаў навейшай гісторыі. Дакументальныя комплексы з гісторыі Беларусі XX ст. (у асноўным перыяду Першай і Другой сусветных войнаў) ў т.зв. Рускім замежным гістарычным архіве (РЗГА, другая назва архіва — Пражскі) — аддзеле Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі. Крыніцы па гісторыі Беларусі ў Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве ў Санкт-Пецярбургу. Архіў грэка-каталіцкіх мітрапалітаў у складзе архіва Свяцейшага Сінода Праваслаўнай Царквы. Зборы прафесара Жыровіцкай духоўнай семінарыі Паўла Дабрахотава ў архіве Санкт-Пецярбургскага аддзялення Інстытута гісторыі Расійскай акадэміі навук. Беларускі збор Інстытута рускай літаратуры (Пушкінскага дома) Расійскай акадэміі навук : частка збору Ф.Шклярава з Веткі, фонд У.Ператца. Беларускія матэрыялы ў аддзеле рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі: гэта асабістыя фонды П.Гільтэбранта, П.Ратча, П.Добраўскага, А.Цітова і інш.

Корпус дакументаў XIX—XX стст. у архіве Эрмітажа (Санкт-Пецярбург) : вопісы скрыняў і куфраў, выпіскі з судовых справаў, звязаных з разрабаваннем замка (допыты, тлумачальныя запіскі, данясенні эканома замка Бургельскага, даклады аудытарскага дэпартамента, сведчанні Тучкова, пратаколы Следчай камісіі і г.д.).

Рукапісы з бібліятэкі, заснаванай І.Храптовічам у Шчорсах (на Наваградчыне) у Нацыянальнай бібліятэке Украіны імя У.І.Вернадскага, рукапісы з былога "Асалінэума" ва Уроцлаве. Беларускія матэрыялы з ў фондзе ўкраінскага мовазнаўца, фалькларыста і паэта Якава Галавацкага.

Беларускія дакументы ў Нацыянальным дзяржаўным гістарычным архіве ў Львове ў фондзе Львоўскай мітрапаліцкай грэка-каталіцкай кансісторыі.

Беларускія матэрыялы ў дэпартаменце манускрыптаў Нацыянальнай бібліятэкі Францыі: арыгінальныя дакументы і копіі, якія тычацца гісторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай , лісты, мемуары і г.д. Архіўныя крыніцы беларускага паходжання ў бібліятэцы Упсальскага універсітэта, Швецыя. Рукапісы беларускіх друкаваных выданняў XVI-XVII стагоддзяў у бібліятэцы Оксфардскага універсітэта. Выданні Ф.Скарыны : “Першыя кнігі царстваў” і “Малая падарожная кніга” у бібліятэцы Кембрыджскага ўніверсітэта.

## РАЗДЗЕЛ 2. Спосабы і формы вяртання культурнай спадчыны , што апынілася за межамі Беларусі

### *Тэма 2.1. Узнікненне, станаўленне і развіццё інстытута рэстытуцыі*

Паняцце рэстытуцыі. Віды рэстытуцыі. Кампенсатарная рэстытуцыя. Рэстытуцыйная прэтэнзія. Актуальнасць праблемы рэстытуцыі для Беларусі. Замежныя навуковыя даследаванні па праблеме рэстытуцыі. Айчынныя даследаванні ( Т. Гернович, У.Гілеп, Э.Кароль, А.Мальдзіс, І.Мартыненка, Т.Рошчына)

Генезіс і трансфармацыя інстытута рэстытуцыі ў правазнаўстве. Вызначэнне прававога статуса культурных каштоўнасцей, якія былі перамешчаны. Сувязь інстытута рэстытуцыі з іншымі прававымі інстытутамі. Калізійныя нормы міжнароднага права, якія прадугледжваюць вяртанне па прынцыпе " закон месца знаходжання рэчы "(lex rei sitae)Вырашэнне спрэчных пытанняў па праблеме рэстытуцыі культурных каштоўнасцей: кампенсацыя, сацісфакцыя, формы кампенсацыі

Гісторыя рэстытуцыі культурных каштоўнасцей у краінах Еўропы ў XX стагоддзі. Праблемы аховы культурнай спадчыны ў міжнародных канвенцыях. Першыя дамовы ў галіне рэстытуцыі гісторыка-культурнай спадчыны: Гаагская канвенцыя 1907 г. і Версалькая дамова 1919 г. Праект падрыхтаванай у 1933 г. Міжнародным бюро музеяў пры Лізе Нацый Канвенцыі аб рэпатрыяцыі страчаных, выкрадзеных або незаконна адчужаных альбо вывезеных прадметаў, якія прадстаўляюць мастацкую, гістарычную або навуковую цікавасць. Праект праект Канвенцыі аб абароне нацыянальных гістарычных мастацкіх скарбаў. Замацаванне палажэнняў аб рэстытуцыі культурных каштоўнасцей у Лонданскай дэкларацыі 1943 г. і ў Мірных дагаворах 1947 г.Пытанне захавання маральна-этычных нормаў пры рэалізацыі міжнароднага права ў сферы вяртання і рэстытуцыі культурных каштоўнасцей.

### *Тэма 2.2. Міждзяржаўныя канвенцыі і міжўрадавыя пагадненні ў галіне рэстытуцыі*

Механізм дзеяння інстытута рэстытуцыі культурных каштоўнасцей згодна з міжнародным канвенцыям. Пакт Рэрыха. Канвенцыя ЮНЕСКА “Аб абароне культурных каштоўнасцей у выпадку узброенага канфлікту” (14 мая 1954 г.). Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (1966г.). “Аб мерах, накіраваных на забарону і папярэджанне незаконнага ўвоза, вываза і передачы шласнасці на культурныя каштоўнасці” (14 лістапада 1970 г.). “Аб ахове сусветнага культурнай і прыроднай спадчыны” (16 лістапада 1972 г.). Рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН: 1973 г. - вяртанне прадметаў мастацтва краінам-ахвярам экспрапрыяцыі; 1976 г. - ахова і вяртанне твораў мастацтва як частка захавання і далейшага развіцця культурных каштоўнасцяў. Канвенцыя ЮНЕСКА “Аб мерах, накіраваных на забарону і папярэджанне незаконнага ўвоза, вываза і передачы права ўласнасці на культурныя каштоўнасці”. Канвенцыя УНІДРУА “Аб выкрадзеных і незаконна вывезенных культурных каштоўнасцей” (Рым, 24

чэрвеня 1995 г.). Стварэнне ў 1978 г. Міжурадавага камітэта па садзейнічанні вяртанню культурных каштоўнасцей краінам іх паходжання або іх рэстытуцыі ў выпадку незаконнага прысваення (МКСВКЦ, на анг. ICPRCP). Рэгламент работы Камітэта. Дапамога ў правядзенні перамоваў з нагоды рэстытуцыі культурных каштоўнасцяў. Стварэнне ў 1999 г. Фонду Міжурадавага камітэта. Прыняцце ў 2015 г. на нарадзе ўдзельнікаў Канвенцыі 1970 г. Аператыўнага кіраўніцтва па яе выкананню. "Усеагульная дэкларацыя аб культурнай разнастайнасці (абвешчана 2 лістапада 2001 г. на 31-й Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА).

### *Тэма 2.3. Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей Беларусі, перамешчаных у гады Вялікай Айчыннай вайны.*

Праблема вяртання музейных прадметаў у другой палове XX ст. Дзейнасць НДІ краязнаўчай і музейнай работы па ацэнцы музейных стратаў СССР. Перамяшчэнне культурных каштоўнасцей рэспублік СССР ўнутры краіны пасля заканчэння вайны. Лёсы беларускіх каштоўнасцей. Аднаўленне страт беларускіх музеяў. Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР. Дзейнасць А.В.Аладавай. Праблема пошуку месца знаходжання Крыжа Ефрасінні Полацкай. Вываз каштоўнасцей у сувязі з рэпатрыяцыяй насельніцтва ў Польшчу. Пошук згубленых культурных каштоўнасцей у краінах свету на працягу 1940-1980-х гадоў. Кампенсатарная рэстытуцыя. Міжнародна-прававыя і маральныя аспекты кампенсатарнай рэстытуцыі культурных каштоўнасцяў. Дзейнасць еўрапейскіх краін па стварэнню каталогаў страчанай спадчыны ў перыяд Другой сусветнай вайны. Праблема знаходжання музейных экспанатаў у прыватных калекцыях. Перамовы з прыватнымі ўладальнікамі і дзяржаўнымі ведамствамі.

Дзейнасць рэспубліканскага аддзялення Савецкага фонду культуры і Міністэрства культуры БССР. Роля Акадэміі навук БССР, Галоўнага архіўнага ўпраўлення, Дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна, Беларускага

таварыства дружбы і культурных сувязяў з замежнымі краінамі, Таварыства “Радзіма”, кіраўнікоў і мастацтвазнаўцаў беларускіх музеяў па пошуку і вяртанні страчаных і раскіданых па ўсім свеце ўнікальных культурных каштоўнасцей. Камісія “Вяртанне” пры Беларускам фондзе культуры (У.Гілеп, Н.Высоцкая, А.Грыцкевіч, Л.Побаль, Т.Рошчына, В.Скалабан, М.Шумейка, М.Яніцкая). Дзейнасць А.Мальдзіса па пошуку і рэстытуцыі беларускай культурнай спадчыны.

Закон РФ “ Аб культурных каштоўнасцях перамешчаных у Саюз ССР у выніку Другой сусветнай вайны і знаходзячыхся на тэрыторыі Расійскай Фэдэрацыі” . Права Рэспублікі Беларусь на вывезеныя каштоўнасці. Умовы і праблемы вяртання беларускай культурнай спадчыны. Пытанні ідэнтыфікацыі беларускай культурнай спадчыны.

***Тэма 2.4. Культурная палітыка Рэспублікі Беларусь па вяртанню культурнай спадчыны.***

Асноўныя падыходы ў культурнай палітыке Рэспублікі Беларусь па вяртанню культурнай спадчыны. Замацаванне кампетэнцыі па рашэнні ўсяго комплексу пытанняў, звязаных з вяртаннем у Рэспубліку Беларусь гістарычных і культурных каштоўнасцей за Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь 1992 г. «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны». Дзейнасць у 1992-2008 гг. Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны і грамадскай камісіі “Вяртанне”. Дзейнасць беларускіх навукоўцаў і прадстаўнікоў грамадскасці ў сярэдзіне 1990-х гадоў па стварэнні навуковай базы вывезеных каштоўнасцяў і рэалізацыі практыкі па іх вяртанні (Н.Высоцкай, У.Гілепа, Т.Герновіч, Г.Запартыкі, В.Папко, В.Скалабана, А.Сушы, М.Шумейкі, М.Яніцкай). Камісія пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па выяўленню, вяртанню, сумеснаму выкарыстанню і ўвядзенню ў навуковы і культурны абарот нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Беларусі (2009 г.).

"Канцэпцыя выяўлення, апісання, уліку і выкарыстання дакументаў па гісторыі і культуры Беларусі, якія захоўваюцца за мяжой" - "Архіўная Беларусіка" (2014). Стварэнне па замове Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь дзяржаўнай установай "Інстытут культуры Беларусі" Рэестра нацыянальных культурных каштоўнасцяў, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь (2014-2015).

"Кодэкс аб культуры Рэспублікі Беларусь"(2016) – першы беларускі заканадаўчы акт, дзе замацаваны парадак вяртання перамешчаных культурных каштоўнасцей. Прынцыпы рэстытуцыі культурных каштоўнасцей Беларусі згодна артыкулаў Кодекса. Міжведамасная камісія па вяртанні культурных каштоўнасцей (2017 г.) і вынікі яе работы.

Кірункі выяўлення культурнай спадчыны Беларусі за межамі краіны: пошук літаратуры, пошук дакументаў прававога характару, пошук архіўных дакуменаў з указаннем шляхоў перамяшчэння аб'ектаў культурнай спадчыны. Сем зборнікаў "Вяртанне" (1992, 1994, 1996, 1997, 1998, 1999, 2002). Пошук інфармацыі на міжнародных інтэрнет сервісах (Stolen Works of Arts, The Art Loss Registry).

Папаўненне інфармацыі аб замежнай беларусіцы ў выніку мэтанакіраванага вывучэння спецыялізаванай архіўна-музейнай перыёдыкі:"Айчынныя архівы", "Савецкія архівы", "пытанні архівазнаўства"," архіўная справа", " археаграфічны штогоднік", "архівы Украіны" (Украіна), "Украінскі археаграфічны шчэрычнік", "Архіўна справа", "Архіў Радзяньскай Украіны", "Archeion" (Польшча), "Archivmitteilung" (Германія).

Увядзенне ў навуковы і сацыякультурны зварот беларускіх культурных каштоўнасцей, што апыніліся за межамі РБ. Поспехі і перспектывы ў галіне вяртання культурных каштоўнасцей. Часовае вяртанне. Мяккая рэстытуцыя. Віртуальнае вяртанне. Дзейнасць Нацыянальнага мастацкага музея, Нацыянальнага гістарычнага музея, Нацыянальнай

бібліятэкі Беларусі, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея па вяртанню і сумеснаму выкарыстанню аб’ектаў культурнай спадчыны Беларусі.

Рэканструкцыя страчаных (альбо апісанне тых, што захаваліся) гістарычных кніжных калекцый, якія існавалі ў Беларусі: Радзівілаў, Сапегаў, Храптовічаў і інш. Магчымыя варыянты рэалізацыі праграмы бібліяграфічнай рэканструкцыі: рэпрынтныя выданні вопісаў (ці іх фрагментаў), ілюстраваны каталог часткі кнігазбору, што захавалася, манаграфія па гісторыі бібліятэкі. Стварэнне БЗ "Radziviliana", даследаванні па гісторыі збору, выданне каталога.

***Тэма 2.5. Міжнароднае супрацоўніцтва установ культуры і архіваў у галіне прэзентацыі культурнай спадчыны Беларусі***

Вырашэнне пытання гісторыка-культурнай спадчыны пасля распаду СССР. Рэстытуцыя як пытанне ва ўзаемаадносінах Рэспублікі Беларусь з іншымі дзяржавамі. Правапераемнасць дзяржаў і праблемы перамяшчэння культурных каштоўнасцей. Фарміраванне адзінай культурнай прасторы краін-удзельніц СНД. Праблема рэстытуцыі культурных каштоўнасцей у межах супрацоўніцтва краін СНД. Двухбаковыя дамовы і пагадненні, заключаныя па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Пагадненне аб правапераемнасці ў адносінах да дзяржаўных архіваў былога СССР (6 ліпеня 1992 г.). Пагадненне аб супрацоўніцтве мытных службаў па пытаннях затрымання і вяртання культурных каштоўнасцей, якія незаконна вывозяцца і ўвозяцца (15 красавіка 1994 г., г. Масква), Пагадненне краін-удзельніц СНД аб барацьбе супраць крадзяжоў культурных каштоўнасцей і забеспячэнні іх зварота (5 кастрычніка 2007 г. Душанбэ).

Стварэнне экспертных груп па культурнай спадчыне і іх задачы: распрацоўка і разгляд спісаў найважнейшых каштоўнасцяў гістарычнай і культурнай спадчыны, якія знаходзіліся на тэрыторыі іх дзяржаў і былі

звязаны з агульнай гісторыяй і культурай, абмеркаванне метадаў інвентарызацыі унесеных у гэтыя спісы аб'ектаў, вынікаў іх даследавання.

Пагадненне паміж Міністэрствамі культуры Рэспублікі Беларусь і Літоўскай Рэспублікі (Вільнюс, 12 лютага 2009 г.). Стварэнне сумеснай двухбаковай камісіі па культурна-гістарычнай спадчыне з Украінай ( адпаведнасці з падпісаным 29 красавіка 2010 г.міжурадавым Gагадненнем аб супрацоўніцтве ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны). 25.10. 2010. Пагадненне gаміж дзяржавамі СНД аб вяртанні культурных і гістарычных каштоўнасцяў дзяржавам іх паходжання.

*Спробы вяртання дакументальнай спадчыны.* Дзейнасць дырэктара БДАМЛМ Г.В.Запартыка па вяртанню творчай спадчыны і дакументальных матэрыялаў деячоў культуры беларусі. Перадача польскім бокам копіі некалькіх старонак метрычнай кнігі, што знаходзіцца ў архіве Ордэна паўлінаў на яснай гары ў Чэнстахове, з запісам аб хрышчэнні Адама Міцкевіча ў дар музею паэта ў Навагрудку. Вяртанне у Мінск з Беластока бібліятэкі імя А. Міцкевіча. Міжнародны савет па распрацоўцы віртуальнай рэканструкцыі дакументальнай спадчыны і бібліятэкі Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў (2006).

Атрымаўнне электроннай копіі Лаўрышаўскага Евангелля, арыгінал якога знаходзіцца ў музеі Чартарыйскіх у г. Кракаве. Сумесны праект з Расійскай нацыянальнай бібліятэкай па аблічбоўцы бібліятэчных і архіўных калекцый Сапегаў (2010-2011 гг.). Атрыманне Нацыянальнай бібліятэкай з Upper Sorbian навуковай бібліятэкі (г. Гёрліц, Германія) электронных копій одинадцати кніг, выдадзеных Ф. Скарынам .

Рэалізацыя сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Украіны праекта «Бібліятэка Храптовічаў» па вывучэнні, бібліяграфічнай і фіртуальнай рэканструкцыі кніжнага збору, які захоўваўся ў мястэчку Шчорсы (цяпер Д. Шчорсы Навагрудскага раёна).

Абмен копіямі архіўных дакументаў паміж Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі і архівам старажытных актаў у г. Варшаве (2014) . Дамова аб вырабе і абмене лічбавымі копіямі дакументаў паміж Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі і архівам старажытных актаў у г. Варшаве (2016). Перадача польскімі архівістамі перадалі звыш 40 тыс. копій дакументаў з вопісу пад агульнай назвай "Архіў Антонія Тызенгаўза"( 2018).

## 3.ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 3.1.Тэматыка семінарскіх заняткаў

*Тэма 1* **Перамяшчэнне гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ў Расію**

1. Сцягванне дакументальнай спадчыны ў архівасховішча г.Масквы і Пецярбурга пасля ўваходжання беларускіх тэрыторый у склад Расійскай імперыі.
2. Канфіскацыя ў неблаганадзейных асоб і перавоз дакументальнай спадчыны і твораў мастацтва ў Расію пасля падзей 1830-1832 і 1863-1864 гадоў.
3. Дзейнасць расійскіх навуковых устаноў і экспедыцый па вывучэнню, збіранню гісторыка-культурнай спадчыны на тэрыторыі Беларусі.
4. Перавоз калекцыі графа Румянцава з Гомеля ў Маскву. "Архіў заходнерускіх уніяцкіх мітрапалітаў" як аснова Румянцаўскага музея ў Маскве.
5. Перавоз у Расію сваіх калекцый прыватнымі збіральнікамі
6. Зборы беларускай дакументальнай спадчыны ў прыватных калекцыях расійскіх гісторыкаў.
7. Творы выяўленчага мастацтва ў зборах расійскіх музеяў і прыватных калекцыях
8. Калекцыя беларускіх дарэвалюцыйных паштовак
9. Беларуская спадчына ў Дзяржфільмкінафондзе

**Літаратура**

1. Вяртанне: Дакументы і архіўныя матэрыялы па праблемах пошуку і вяртання нацыянальных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. — Мінск,1992.
2. Вяртанне-2: Зборнік артыкулаў і дакументаў. Мінск,1994.

3. Вяртанне-3: Зборнік артыкулаў і дакументаў. Мінск,1996.
4. Выяўленне, сумеснае выкарыстанне і вяртанне архіўных, бібліятэчных і музейных каштоўнасцяў, якія захоўваюцца ў замежных краінах. Мінск: БФК, 1999. — (Вяртанне-6).
5. Герновіч, Т.Д. «Вымыванне» дакументальнай спадчыны ў XIX ст.: ці мажліва вяртанне? / Т.Д. Гярновіч // Архівы на шляху XXI стагоддзя: гісторыя, спадчына, сучаснасць. Матэрыялы Другога беларуска-французскага архіўнага семінара. Мінск, 8-10 лютага 2000 г. - Мн. 2003. – С. 63-66.

1. Гужалоўскі, А. А. Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных установаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыкакультурнай спадчыны (па напрамках)» / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2012. – 302, [1] с.
2. Гужалоўскі, А.А. Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2001. – 124 с.

3. Латушкін, А.М. Дакументальныя страты Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў у пачатку XIX ст. (справа К. Квяткоўскага) / А.М. Латушкін // Беларускі археаграфічны штогоднік / гал. рэд. Э. М. Савіцкі [і інш.]. – Вып. 13. – 2012 г. – С. 149 – 160. (ВАК).
4. Латушкін, А.М. Дакументальныя страты Нясвіжскага архіва Радзівілаў у другой палове XVIII – першай палове XX стагоддзяў / А.М. Латушкін // Архівы і справаводства. – 2007. – № 2. – С.102–107. (ВАК)
5. Латушкін, А.М. Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў у XV – першай палове XX ст.: гістарыяграфія і крыніцы / А.М. Латушкін // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. – Сер. 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2006. – № 2. – С. 3–9. (ВАК)
6. Мальдис, А. И. Белорусские сокровища за рубежом / А. И. Мальдис. — Минск: Лiтаратура i Мастацтва, 2009. — 208 с.
7. Шумейко, М. Ф. Собрать рассеянное: О реституции белорусских архивов в прошлом и настоящем / М. Ф. Шумейко. — Минск: Белорусский фонд культуры, комиссия “Вяртане”, 1997. — 153 с.

**Тэма 2 Тэма Спадчына беларускіх магнацкіх родаў**

1. Родавыя архівы буйных землеўладальнікаў дасавецкага перыяду і іх месца ў архіўнай спадчыне Беларусі.
2. Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў у канцы XVIII - першай палове XX стст. Праграма «Памяць свету".
3. Спадчына роду Радзівілаў у музейных зборах замежных краін.
4. Спадчына Сапегаў у Польшчы, Расіі, Кеніі. "Сапежанскі збор".
5. Спадчына Храптовічаў ва установах сацыяльнай памяці Украіны.
6. Калекцыі Чартарыйскіх і іх лёс. Мастацкія калекцыі Чартарыйскіх у складзе Нацыянальнага мастацкага музея ў Варшаве.
7. Калекцыі Чапскіх і іх перавоз у Кракаў і Маскву.

**Літаратура**


1. Вяртанне: Дакументы і архіўныя матэрыялы па праблемах пошуку і вяртання нацыянальных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. — Мінск,1992.

2. Вяртанне-2 : Зб. арт., дакументаў і арх. матэрыялаў па прабл. пошукаў і вяртання нац. каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэсп. Беларусь / Беларус. фонд культуры і інш. — Мн., 1994. – 270 с.

3. Вяртанне-3 : Зб. арт., дакументаў і арх. матэрыялаў па прабл. пошукаў і вяртання нац. каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэсп. Беларусь / Беларус. фонд культуры і інш. — Мінск,1996.
4. Вяртанне-6: Выяўленне, сумеснае выкарыстанне і вяртанне архіўных, бібліятэчных і музейных каштоўнасцяў, якія захоўваюцца ў замежных краінах. - Мінск: БФК, 1999.ў замежных краінах. Мінск: БФК, 1999. — (Вяртанне-6).
5. Герновіч, Т.Д. «Вымыванне» дакументальнай спадчыны ў XIX ст.: ці мажліва вяртанне? / Т.Д. Гярновіч // Архівы на шляху XXI стагоддзя: гісторыя, спадчына, сучаснасць. Матэрыялы Другога беларуска-французскага архіўнага семінара. Мінск, 8-10 лютага 2000 г. - Мн. 2003. – С. 63-66.

6. Гужалоўскі, А. А. Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных установ, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-23 01 12 «Музейная

справа і ахова гісторыкакультурнай спадчыны (па напрамках)» / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2012. – 302, [1] с.
7. Гужалоўскі, А.А. Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2001. – 124 с.
8. Латушкін, А.М. Да гісторыі Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў у 1790—1818 гг. / А.М. Латушкін // Беларус. археаграф. штогод. – 2005. – № 6. – С. 46–60. (ВАК)
9. Латушкін, А.М. Дакументальныя страты Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў у пачатку XIX ст. (справа К. Квяткоўскага) / А.М. Латушкін // Беларускі археаграфічны штогоднік / гал. рэд. Э. М. Савіцкі [і інш.]. – Вып. 13. – 2012 г. – С. 149 – 160. (ВАК).
10. Латушкін, А.М. Дакументальныя страты Нясвіжскага архіва Радзівілаў у другой палове XVIII – першай палове XX стагоддзяў / А.М. Латушкін // Архівы і справаводства. – 2007. – № 2. – С.102–107. (ВАК)
11. Латушкін, А.М. Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў (1914 – 1941 гг.) / А.М. Латушкін // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. / Гістарычны факультэт Беларус. дзярж. ун-та. – Мінск, 2006. – Вып. 1 – С. 193–199. (ВАК)
12. Латушкін, А.М. Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў у XV – першай палове XX ст.: гістарыяграфія і крыніцы / А.М. Латушкін // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. – Сер. 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2006. – № 2. – С. 3–9. (ВАК)
13. Мальдис, А. И. Белорусские сокровища за рубежом / А. И. Мальдис. — Минск: Літаратура і Мастацтва, 2009. — 208 с.
